У нядзелю ў Камянцы (Брэсцкая вобласць) адбылося ўрачыстае адкрыццё бюста двойчы Герою Сацыялістычнай Працы, старшыні ўзорнага калгаса “Советская Белоруссия” Уладзіміру Бядулі. Бюст выраблены згодна з указам прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі і ўстаноўлены ў скверы перад Домам культуры ў Камянцы. На ўрачыстасці з выпадку адкрыцця перад шматлікімі прысутнымі — -сябрамі старшыні, прадстаўнікамі ўладаў, журналістамі, жыхарамі райцэнтра і калгаснікамі — -выступілі першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Уладзімір Русакевіч і старшыня Брэсцкага аблвыканкама Уладзімір Заламай, іншыя афіцыйныя асобы. Яны падкрэслілі, што Уладзімір Бядуля, які нарадзіўся на Камянеччыне і 42 гады аддаў “Советской Белоруссии”, дастойны памятнага бюста пры жыцці.

Валянціна КАЗЛОВІЧ, БелаПАН.

Аб памеры ўтрымання з наймальнікаў сродкаў для забеспячэння своечасовай выплаты заработнай платы

У сувязі з апублікаваннем за кастрычнік 1997 г. індэкса спажывецкіх цэн Міністэрства працы і Міністэрства статыстыкі і аналізу Рэспублікі Беларусь паведамляюць.

У кастрычніку мінімальны спажывецкі бюджэт (МСБ) на аднаго члена сям’і з чатырох чалавек склаў 2101804 (2036632 x 1,032) рублі ў месяц.

Згодна з пастановай Мінпрацы і Мінстата ад 22.02.1996 г. нумар 13/4 для забеспячэння своечасовай выплаты заработнай платы неабходна ўтрымліваць з наймальнікаў суму ў памеры 60 працэнтаў МСБ, гэта значыць 1261080 рублёў на кожнага работніка ў2101804 x 60:100).

Названы нарматыў прымяняецца з дня апублікавання ў друку пры падачы заяўкі для атрымання сродкаў на заработную плату і пагашэнне яе запазычанасці незалежна ад тэрмінаў утварэння.

Стоп-кадр

За прялкой длинные зимние вечера будут проходить быстрее, считает Ирина Ивановна Трутько из деревне Соколово Березовского района.

Фото Романа КОБАКА, БелТА.

Еўрапейцы нагадваюць, што трэба вяртацца да дэмакратыі і законнасці

Прадстаўнікі парламенцкай асамблеі Савета Еўропы і парламентарыі Швейцарыі спадары Фрэй і Мюллеман, якія наведалі Беларусь, сустрэліся з дэпутатамі Вярхоўнага Савета Станіславам Багданкевічам і Станіславам Шушкевічам. Цікавыя рэчы ўсплылі ў час гэтай сустрэчы.

Як вядома, госці з Еўропы мелі сустрэчу з прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам. Па беларускім тэлебачанні было сказана, нібыта яны выказалі падтрымку беларускім уладам. Як зазначылі самі Фрэй і Мюллеман, яны выказалі прэзідэнту пажаданні наконт аднаўлення ў краіне Канстытуцыі 1994 года, дзейнасці Вярхоўнага Савета 13-га склікання і забеспячэння свабоды інфармацыі. Яны заявілі аб немагчымасці ўступлення Беларусі ў Савет Еўропы без выканання гэтых умоў.

Спадары Фрэй і Мюллеман адмовіліся ад сустрэчы з работнікамі Палаты прадстаўнікоў і Савета рэспублікі, бо лічаць адзіным легітымным органам заканадаўчай улады ў Беларусі Вярхоўны Савет 13-га склікання.

Андрэй СЯРГЕЕЎ.

У мінулыя выхадныя ў ЗША адбылося рабочае пасяджэнне рады Беларускай народнай рэспублікі

У Нью-Брансвіку, што пад Нью-Йоркам, адбылося рабочае пасяджэнне Рады Беларускай Народнай Рэспублікі. Як паведаміў БелаПАН намеснік старшыні Рады Сяргей Навумчык, галоўным накірункам дзейнасці гэтага органа застаецца спрыянне беларускай дэмакратыі праз уплыў на ўрадавыя і грамадскія арганізацыі краінаў Захаду. Сёння, паведаміў С.Навумчык, Рада ўшчыльную падышла да фарміравання беларускага лобі ў Кангрэсе ЗША; ужо вядуцца перамовы з сенатарамі і кангрэсменамі. Мэтай усяго гэтага, па словах Навумчыка, з’яўляецца “аказанне максімальнага ўціску на рэжым А.Лукашэнкі”. На пасяджэнні Рады абмяркоўваліся пытанні ўзаемадзеяння з рознымі палітычнымі сіламі Беларусі. На думку С.Навумчыка, гэтыя кантакты павінны быць як мага шырэйшымі з усімі, хто прызнае ідэалы беларускай незалежнасці. “Нас вельмі турбуе, што міжнародная рэакцыя на лукашэнкаўскую дыктатуру цалкам абмінае такі аспект, як этнічная дыскрымінацыя беларусаў, якая выяўляецца, паміж іншым, і ў закрыцці беларускіх школ”, — сказаў Навумчык. У сувязі з гэтым Рада БНР звярнулася да АБСЕ з прапановамі накіраваць на Беларусь спецыяльную міжнародную камісію, якая б разгледзела факты дыскрымінацыі па нацыянальнай прыкмеце. С.Навумчык таксама паведаміў, што месяц таму ў Канадзе сябры Рады БНР стварылі фонд, прызначаны для дапамогі беларускім студэнтам, рэпрэсаваным за ўдзел у масавых акцыях. Акрамя гэтага, бліжэйшым часам будуць адпраўлены пасылкі з дапамогай больш як 27 сем’ям з Нясвіжскага раёна, якія пацярпелі ад сёлетняга ўрагану. С.Навумчык адзначыў, што дапамагчы можна было б значна большай колькасці людзей, але беларускія ўлады ўвялі такую вялікую пошліну на гуманітарную дапамогу, што аплаціць яе Рада БНР не ў стане.

Наталля КУЛАГІНА, БелаПАН.

ДА ЎВАГІ ПАДПІСЧЫКА!

Адпаведна дагаворам, заключаным з рэдакцыямі (выдавецтвамі), пры афармленні падпіскі прадпрыемствы сувязі ажыццяўляюць пасрэдніцкія паслугі па распаўсюджванні і дастаўцы, таму за нявыхад (несвоечасовы выхад) з друку газет і часопісаў адказнасць перад падпісчыкам нясе рэдакцыя (выдавецтва).

Праверце правільнасць афармлення абанемента, на абанеменце павінен быць пастаўлены адбітак касавай машыны. Пры афармленні падпіскі (пераадрасоўкі) без касавай машыны на абанеменце ставіцца адбітак каляндарнага штэмпеля аддзялення сувязі. У гэтым выпадку абанемент выдаецца падпісчыку з квітанцыяй аб аплаце кошту падпіскі (пераадрасоўкі).

Для афармлення падпіскі на газету ці часопіс, а таксама для пераадрасавання выдання бланк абанемента з даставачнай картачкай запаўняецца падпісчыкам чарнiламі, разборліва без скарачэнняў, у адпаведнасці з умовамі каталога.

Запаўненне месячных клетак пры пераадрасаванні выдання, а таксама клеткі “ПВ-МЕСЦА” выконваецца работнікамі прадпрыемстваў сувязі.

Неабыякавы погляд

Калі не захоўваць чысціню на вуліцах, то не будзе яе і ў нашых душах

Сярод гандлёвых радоў няспешна праходжваецца жанчына гадоў трыццаці з прыкладна шасці-сямігадовым сынам. Маці спыняецца ля аднаго гандляра, ля другога, цікавіцца коштам тлушчу, селядцоў, паўфабрыкатаў і, відаць, не задаволеная пачутым, ідзе далей. А ў хлапчаняці разбягаюцца вочы ад розных цукерак, шакаладак, апельсінаў, вінаграду, бананаў. Ён цягне маці за яе модную скураную куртку і просіць гучна і настойліва, не зважаючы на мноства людзей побач: “Мам, купі. Я хачу шакаладку. Хачу!..” — “Адчапіся, у нас грошай цяпер няма. А шакаладка дарагая”, — перабівае сына маці і, моцна ўзяўшы яго за руку, ужо літаральна цягне за сабою па базары.

Але праз нейкі час памякчэла, відаць, мацярынскае сэрца, палагаднеў твар жанчыны. Хоць і не купіла нічога, ды ўсё ж папрасіла на выхадзе з рынку чарнявага хлопца-гандляра ўзважыць ёй два бананы.

Так атрымалася, што далейшы наш шлях супаў, і было прыемна назіраць за малым, які літаральна глытаў свой банан кавалкамі, весела падскокваючы побач з маці то на адной, то на другой назе. І вось у руцэ хлопчыка засталіся адны лупіны, на якія, як падалося, ён зірнуў з гэткім, змяніўшым яго нядаўнюю радасць, дзіцячым сумам у вачах і расчаравана, а мо і са злосцю шпурнуў тое, што было ў руцэ, на тратуар наперад сябе.

Падумалася адразу ж: зараз пачнецца выхаваўчы суд маці над сынам. Гэта ж трэба! Кінуў лупіны прама пад ногі людзям. Што будзе, калі кожны так зробіць? У што ператворым нашы вуліцы?

Але жанчына аніяк не адрэагавала на гэткія дзеянні свайго чада, спакойна пераступіла тое, што засталося ад банана, працягваючы няспешна даядаць свой. А даеўшы яго, гэтак жа спакойна кінула рэшткі на зямлю. Праўда, не перад сабою на тратуар, а крыху ўбок, не абцяжарваючы сябе спробай убачыць сметніцу. А яна, між іншым, стаяла ў нейкіх дзесяці метрах наперадзе і сваім кідкім знешнім выглядам быццам напамінала людзям: “Я тут для таго, каб чыстымі былі нашы вуліцы”.

Але, мабыць, не асабліва ўздзейнічала гэта на людзей, бо ўсюды, куды ні павернеш галаву, кідалася ў вочы рознае смецце! Малыя і вялікія кавалкі паперы, цукеркавыя і снікерсавыя абгорткі, тыя ж бананавыя лупіны. І валялася ўсё гэта пад нагамі не таму, што адсутнічалі сметніцы: якраз сёння іх дастаткова і на гарадскім рынку нашага райцэнтра Івацэвічы, і на ягоных вуліцах. Але-але... Не прывучаны чамусьці нашыя людзі карыстацца імі. Не любяць яны абцяжарваць сябе гэткім клопатам: пранесці ў руцэ некалькі метраў тое, што засталося ад банана ці апельсіна, каб не кідаць пад ногі і сабе, і іншым. Ат, падумаеш, вуліца ж гэта, прыбяруць, за гэта ж і грошы атрымліваюць камунгасаўскія прыбіральшчыцы.

Дарэчы, мяркуючы па ўсім, у большасці сваёй так думаюць нашы людзі не толькі на вуліцы, але і ў сваіх дварах каля шматпавярховак і нават у сваіх уласных пад’ездах. Не задумваюцца мужчыны, куды кінуць скамечаны цыгарэтны пачак ці карабок ад запалак, кідаюць прама пад ногі паперу ад марожанага жанчыны. А ўжо падлеткі, дык тыя і ў думках не дапускаюць, што сметніцы пастаўлены для таго, каб імі карысталіся.

Вось дзесяцігадовая дзяўчынка пад маўклівую згоду крочачых побач маладых таты і мамы кінула ўбок апусцелы мяшэчак з-пад ледзянцоў. Вось група 15-гадовых “хабзайцаў” дружна і са смехам запусціла ў прабягаўшага ката рэшткі ад з’едзеных бананаў. А вось даволі інтэлігентны з выгляду мужчына сталага ўзросту, незадаволена патросшы перад сабою апусцелым запалкавым карабком, шпурнуў яго на тратуар. Ды што тут казаць пра нейкіх там падлеткаў ці гэтага мужчыну, калі жанчына сярэдніх гадоў, дзелавіта цягнучы за сабою напоўненую нечым да адказу вялікую сумку на калёсіках, даела сваю булачку, якую далікатна гэтак культурна трымала двума пальцамі ў паперцы, і апошнюю зняважліва кінула прама пад ногі ідучай насустрач другой жанчыне. І ні ценю сораму на твары першай, ні папроку з боку другой. “Ну, не робяць жа яны гэтак дома, у сваіх кватэрах”, — падумаў ураз, акінуўшы вокам даволі моднае адзенне абедзвюх кабет.

Відаць, зноў жа вуліца у іх разуменні — гэта не дом, які трэба прыбіраць уласнымі рукамі. Тут іншыя прыбіраюць, а значыць, можна кідаць смецце. Так ці некалькі інакш думаюць многія нашы людзі, кідаючы на вуліцах і плошчах сабе пад ногі рознае смецце, цяжка сказаць. Можа, ніяк не думаюць, кідаюць — ды ўсё тут. Хто і дзе вучыў іх задумвацца пра гэткія дробязі? Ды яшчэ сёння, калі ад іншых праблем галава кругам ідзе. Дастаткова пастаяць на вуліцах нашага горада, дый, пераканаяны, не толькі нашага, з якіх паўгадзіны, каб упэўніцца, што ўсе мы — люстэрка нашага як некалішняга, так і сённяшняга грамадства. Абыякавыя да ўсяго, што тычыцца нас асабіста. Меркантыльныя ў адносінах да ўласных патрэб, але амаль цалкам раўнадушныя да клопатаў іншых. Малакультурныя ў сваіх паводзінах як на вуліцы, так, скажам, і ў той жа палітыцы, бо лічым, што не яна, а мы самі вырашаем сёння наш дабрабыт. Грэбуем даволі часта не толькі чысцінёй на вуліцах і ў пад’ездах, але і ва ўласных душах, не абцяжарваючы сябе ў думках пра нейкую там законнасць у грамадстве, пакуль гэта законнасць не датычыць нас асабіста — як, кінуўшы пад ногі на вачах уласнага ці чужога дзіцяці скамечаную паперку, не ўстрывожваемся, што паказваем дрэнны прыклад юнай істоце, так і не задумваемся асабліва, пры якіх законах і парадках будуць жыць нашы дзеці заўтра-паслязаўтра, бо, подбегам спяшаючыся на выбарчыя ўчасткі, не думаем, за што галасуем і што дасць гэта будучым пакаленням.

Культура паводзін на вуліцы, культура мыслення, культура свядомасці — грамадскай, палітычнай... Ці не з аднаго кораня вырастае ўсё гэта?

“Культура, — гаворыць вядомы слоўнік С.Ожагава, — гэта сукупнасць дасягненняў чалавека ў вытворчых, грамадскіх і разумовых зносінах”. Мы, савецкія ці ўжо постсавецкія людзі, асаблівыя. Нам няма роўных па скрыўленню агульнапрынятага разумення культуры. Мы не такія. Таму і жывём, відаць, па-іншаму: з брудам на вуліцах, на сумленні, у заканадаўстве, палітыцы.

Не, усё, літаральна ўсё мае свае карані. На пустым месцы нічога не вырастае. Што пасеялі некалі пад трыумфальнае шэсце ленінска-сталінскіх і хрушчоўска-брэжнеўскіх ідэй, тое і жнём, укалыхваючы сябе ідэямі новых правадыроў. На гэты раз уласных, беларускіх. Праўда, з усё той жа маскоўска-бальшавіцкай закваскай.

Мікалай РЫМАЧ.
г.Івацэвічы.

Октябрь 1917—1997

Социализм гарантирует обнищание

Андрей ИЛЛАРИОНОВ,
Институт экономического анализа

В начале XX века во многих странах мира распространение социалистических идей сопровождалось невиданным энтузиазмом. Попытки практического воплощения социализма породили огромные ожидания среди миллионов людей. К концу XX века глобальный провал социалистического экономического эксперимента стал неоспоримым.

В течение долгого времени коммунистическая пропаганда старательно поддерживала миф об экономических преимуществах социализма, а официальная статистика социалистических стран сознательно фальсифицировала результаты их социально-экономического развития. Эта идеологическая мифология настолько разительно контрастировала с реалиями настоящей жизни, что пересечение государственных границ между "общественно- экономическими формациями", причем в обе стороны, нередко сопровождалось настоящим шоком.

Сегодня появилась возможность объективно оценить результаты экономического развития бывших и нынешних социалистических стран по сравнению со странами с рыночной экономикой. В Институте экономического анализа их макроэкономические показатели за послевоенные десятилетия были пересчитаны в соответствии со стандартами международной статистики в постоянных ценах в США по паритетам покупательской способности.

Для того чтобы сделать сопоставления наиболее аккуратными, мы ограничились лишь периодом мирного существования социалистических стран. Хотя многие разрушительные войны и революции были вызваны в том числе и попытками реализации социалистической утопии, и потому их результаты, строго говоря, также следовало бы относить к последствиям социализма.

За старт относительно мирного социалистического эксперимента для большинства стран был принят 1950 год, к началу которого в основном было завершено послевоенное восстановление экономик бывшего СССР, стран Центральной и Восточной Европы, и уже начались социалистические преобразования в КНР, созданной в 1949 г. Для КНДР начальным годом стал 1954 г. — первый год после завершения войны в Корее, для Кубы — 1959 год, в канун которого армия Ф.Кастро вошла в Гавану, для Вьетнама - 1976 год, следующий за окончательным прекращением вьетнамской войны и объединением Севера и Юга.

В качестве рубежа, когда "классические" социалистические эксперименты завершились, приняты годы накануне начала рыночных реформ: в Китае — 1978 г., во Вьетнаме — 1988 г., в большинстве европейских стран — 1989 г., в бывшем СССР — 1991 г. Поскольку в КНДР и на Кубе государственная экономика продолжает господствовать, для них завершающей датой выступает 1996 г.

Результаты экономического развития социалистических стран за прошедшие годы говорят сами за себя (см. табл.). Хотя во многих странах отмечались положительные темпы роста, а в некоторых странах рост валового внутреннего продукта на душу населения был довольно заметным, все они без исключения отстали от своих "рыночных" соседей, которые развивались гораздо быстрее.

Это правило действует везде: и в Европе, и в Азии, и в Латинской Америке. Социалистический эксперимент приводит не к преодолению, а к усилению социально-экономической отсталости.

Если в чем и есть различия, то только в скорости отставания. Относительно успешно развивались лишь Словения и Хорватия — бывшие югославские республики, где элементы рыночной экономики, пусть и в ограниченном виде, проводились в жизнь наиболее последовательно. В наибольшей же степени социалистический кризис поразил Северную Корею и Кубу, в которых внедрялись наиболее одиозные модели тоталитарной экономики.

Экономическая катастрофа, принесенная социализмом, отбросила Кубу, входившую в 50-х годах в четверку наиболее богатых латиноамериканских государств, в число самых бедных стран Западного полушария. Двадцатое столетие Куба завершает с реальным доходом на душу населения вдвое меньшим, чем в 1950 г.

Справедливости ради надо признать, что сам по себе переход от социализма к рыночной экономике еще не гарантирует автоматического процветания. Успех или неудача в рыночных условиях в решающей степени зависит от проводимой экономической политики. Но шанс на успех есть у всех.

В условиях же социализма такого шанса нет. Он гарантирует обнищание всем, вступившим на этот путь. Можно спорить, действительно ли при капитализме богатые всегда и везде становятся богаче, а бедные — беднее. Но даже если это и было бы так, то при социализме бедными гарантированно становятся все — и богатые, и бедные.

ВВП на душу населения в течение социалистического эксперимента

	В долл. США по ППС в ценах 1993 г.		В % к уровню соответствующей страны		Изменение относительного уровня, процентных пунктов
	Начало периода	Конец периода	Начало периода	Конец периода	
Западная Германия в 1950—1991 гг.	4891	21583			
В % к Западной Германии:					
Россия	2475	6337	50,6	29,4	-21,2
Украина	2226	4810	45,5	22,3	-23,2
Беларусь	1658	6197	33,9	28,7	-5,2
Финляндия в 1950—1991 гг.	4399	16464			
В % к Финляндии:					
Эстония	2696	5127	61,3	31,1	-30,2
Латвия	2636	5486	59,9	33,3	-26,6
Литва	2035	5480	46,3	33,3	-13,0
Греция в 1950—1991 гг.	2042	10833			
В % к Греции:					
Россия	2475	6337	121,2	58,5	-62,7
Украина	2226	4810	109,0	44,4	-64,6
Молдова	1994	3152	97,6	29,1	-68,5
Грузия	1844	3252	90,3	30,0	-60,3
Армения	1931	4084	94,6	37,7	-56,9
Турция в 1950—1991 гг.	1543	5031			
В % к Турции:					
Молдова	1994	3152	129,2	62,6	-66,6
Украина	2226	4810	14463	95,6	-48,7
Грузия	1844	3252	119,5	64,6	-54,9
Армения	1931	4084	125,2	81,2	-44,0
Азербайджан	2077	3753	134,6	74,6	-60,0
Иран в 1950—1991 гг.	2276	5275			
В % к Ирану:					
Армения	1931	4084	84,9	77,4	-7,4
Азербайджан	2077	3753	91,2	71,1	-20,1
Казахстан	2299	3395	101,0	64,3	-36,7
Туркменистан	2569	2884	112,9	54,7	-58,2
Пакистан в 1950—1991 гг.	1179	2312			
В % к Пакистану:					
Казахстан	2299	3395	195,0	146,8	-48,2
Туркменистан	2569	2884	217,9	124,8	-93,1
Узбекистан	1820	2639	154,4	114,1	-40,2
Киргизия	1845	3092	156,5	133,7	-22,7
Таджикистан	1694	2187	143,6	94,6	-49,1
Западная Германия в 1950—1989 гг.	4891	20010			
В % к Западной Германии:					
ГДР	3567	10600	72,9	53,0	-20,0
Польша	2148	5402	43,9	27,0	-16,9
Чешская Республика	4146	10683	84,8	53,4	-31,4
Словакия	2603	7701	53,2	38,5	14,7
Австрия в 1950—1989 гг.	4419	18226			
В % к Австрии:					
Чешская Республика	4146	10683	93,8	58,6	-35,2
Словакия	2603	7701	58,9	42,3	-16,7
Венгрия	2913	7455	65,9	40,9	-25,8
Италия в 1950—1989 гг.	3746	17243			
В % к Италии:					
Словения	2836	12646	75,7	73,3	-2,4
Хорватия	1890	7974	50,4	46,2	-4,2
Черногория	1378	4655	36,8	27,0	-9,8
Албания	1212	3108	32,3	18,0	-14,3
Греция в 1950—1989 гг.	2042	10695			
В % к Греции:					
Албания	1212	3108	59,3	29,1	-30,3
Черногория	1378	4655	67,5	43,5	-24,0
Босния и Герцеговина	1492	4289	73,1	40,1	-33,0
Сербия	1437	5779	70,4	54,0	-16,3
Македония	1114	4089	54,6	38,2	-16,3
Румыния	1422	4704	69,6	44,0	-25,7
Болгария	1220	5460	59,7	51,1	-8,7
Турция в 1950—1989 гг.	1543	4772			
В % к Турции:					
Албания	1212	3108	78,5	65,1	-13,4
Босния и Герцеговина	1492	4289	96,7	89,9	-6,8
Тайвань в 1950—1978 гг.	1185	5431			
Китай в % к Тайваню	276	671	23,3	12,3	-11,0
Таиланд в 1976—1988 гг.	2216	3945			
Вьетнам в % к Таиланду	705	1019	31,8	25,8	-6,0
Южная Корея в 1954—1996 гг.	1216	12802			
КНДР в % к Южной Корее	876	1864	72,0	14,6	-57,5
Доминиканская Республика в 1959—1996 гг.	1737	3859			
Куба в % к Доминиканской Республике	3337	2361	192,1	61,2	-131,0

Источник: Институт экономического анализа.

("Известия".)

Анатолий Чубайс подал в отставку. Борис Ельцин ее не принял

В минувшие выходные команда молодых российских реформаторов понесла тяжелые потери. Поводом к двум отставкам в правительственной команде Анатолия Чубайса и одной в руководстве Администрации президента послужил гонорар за неизданную книгу о российской приватизации в размере 450 тысяч долларов пятерым ее авторам. Причины разразившегося скандала уходят корнями в конфликт между мощными финансовыми кланами. Из Минска трудно различить, кто там с кем чего не поделил, тем более что и сама Москва в лице ведущих своих телеканалов транслировала миру противоречивые и подчас взаимоисключающие версии сенсационного события.

Ясно лишь одно: за сомнительные 90 тысяч долларов президент России Борис Ельцин не отдал первого вице-премьера и министра финансов Анатолия Чубайса. В субботу 15 ноября уже после падения соавторов Чубайс подал прошение об отставке, но она не была принята Ельциным. Патриах российской демократии сделал по телефону внушение своему последователю, и тем дело обошлось.

Точка на карте

Авианосец "Джордж Вашингтон" в Персидском заливе

К концу прошедшей недели до предела обострилась ситуация на Ближнем Востоке. А началось все, кажется, из-за пустяка... Официальный Багдад выдворил из страны американских инспекторов ООН, обвинив их в шпионской деятельности. Последовала жесткая протестующая резолюция ООН, которую проигнорировал глава Ирака Саддам Хусейн.

За считанные дни конфликт получил бурное развитие. США использовали аргумент в виде сосредоточенных в Персидском заливе 24 кораблей Военно-морских сил с 300 самолетами на борту. К эскадре присоединился и авианосец "Джордж Вашингтон".

К обсуждению тревожной ситуации подключились Англия и Франция. В воскресенье, 16 ноября, о кризисе в Ираке двадцать минут говорили по телефону президент США Билл Клинтон и президент Российской Федерации Борис Ельцин.

Саддам Хусейн делал заявления о том, что "третью мировую войну" он уже выиграл в 1991 году в аналогичном по коренным своим причинам противостоянии с Америкой. Арабский мир бурлил, в странах Ближнего Востока люди объединялись в отряды ополчения и "живые заслоны". На сей раз сторону Ирака держал даже нефтеносный Кувейт, сам подвергавшийся жесткой агрессии со стороны воинственного соседа.

Похоже, на сей раз лозунг "Нет бомбежкам!" превалировал над решимостью американцев дать команду для старта с авианосцев самолетов-невидимок.

Женская дружба

Хиллари Клинтон и Наина Ельцина в Екатеринбурге

Впервые вместе провели уикэнд две первые леди — Соединенных Штатов Америки и Российской Федерации. Для встречи дамы выбрали родные места Бориса Николаевича, где и провели минувшую субботу. Действующим лицом была, главным образом, супруга американского президента, которая по ходу вояжа обучала российских жен и дев, как слабому полу следует организовываться и защищать свои интересы. Хозяйка и гостья побывали в заведении, где обучались будущие супруги Ельцины и где начинался их роман. Хиллари растрогал рассказ Наины о том, как в стенах свердловского тогда учебного заведения влюбленные обменялись первым поцелуем, и она напомнила эту историю на встрече с нынешними екатеринбургскими студентами.

Одна из сообразительных девушек не замедлила уточнить у госпожи Ельциной: "Подскажите, где в этом здании надо поцеловаться с парнем, чтобы потом оказаться женой президента?" Проблему завоевания своего места на вершине власти юные российские девы поняли по-своему, а совсем не так, как объясняла Хиллари Клинтон — предприимчивый энергичный самостоятельный юрист и общественный деятель, а уже потом — жена президента.

Соб.инф.

Литва

Ландсбергис — за развитие Литвы "без потрясений, метаний и революций"

"Я — за независимость Литвы и свободный выбор людей и страны, ее свободу от зарубежного диктата: не колеблюсь по вопросу членства в ЕС и НАТО. Моя линия — последовательность и постоянство государственной политики, западное развитие демократии без потрясений, метаний и революций", — заявил председатель сейма (парламента) Витаутас Ландсбергис, представляя журналистам в Вильнюсе свою предвыборную программу.

Судя по итогам опросов, В.Ландсбергис является одним из трех самых реальных претендентов на пост президента, выборы которого состоятся 21 декабря.

Отвечая на вопрос "Интерфакса", спикер заверил, что в случае его избрания главой государства "внешняя политика Литвы, особенно по отношению к России, меняться не будет или изменится только в лучшую сторону".

Он считает, что "в проводимой Литвой политике по отношению к Западу и Востоку нет внутреннего противоречия, как это видят некоторые правительственные круги России, опутанные мышлением прошлого".

По убеждению В.Ландсбергиса, "Россия будет все более и более одобрять сотрудничество его страны с Североатлантическим альянсом и вступление Литвы в НАТО не будет расцениваться Москвой как враждебное действие или хождение к врагу".

В.Ландсбергис отметил тот факт, что Москва, подписав с НАТО акт о сотрудничестве, тем не менее продолжает считать Североатлантический альянс врагом. "Уверен, что Россия вырастет из этой детской болезни левизны, а мы будем иметь время встать на порог НАТО без конфликтов с Россией и может быть даже поможем ей интегрироваться в новый мир сотрудничества", — сказал В.Ландсбергис.

Глава сейма подчеркнул, что в случае победы на президентских выборах обещает преемственность государственной политики, начало которой было положено 11 марта 1990 года. Он вновь подчеркнул, что "революционных изменений" во внешней политике не будет.

В.Ландсбергис также сообщил, что в случае победы на выборах он намерен "сдержать обещание правительства и компенсировать жителям Литвы их обесценившиеся рублевые вклады".

Лекарства продлевают жизнь. И приостанавливают развитие СПИДа

Количество смертных случаев среди больных СПИДом за последний год резко сократилось. Агентство ДПА сообщает, что, по данным исследований, количество смертей среди больных СПИДом мужчин сократилось в последнее время на 25, а женщин — более чем на 10 процентов. Агентство отмечает, что главную заслугу этого американские врачи видят в том, что новые лекарства от вируса иммунодефицита человека позволяют значительно продлить жизнь больным и практически приостановить развитие самой болезни. Однако, несмотря на все оптимистичные заявления, врачи констатируют, что о полном излечении от СПИДа говорить пока не приходится, сообщает агентство ДПА.

Сучасныя сюжэты

Мікола Капыловіч, пісьменнік

Бяздушнасць

У чарзе перада мною — малады мужчына, а ён стаіць за пажылым: сагнутая спіна, цмяныя і быццам выцертыя каўняром валасы на патыліцы. Стаіць вольна. Да маладога падыходзіць жанчына, няйначай жонка, і змяняе яго.

— За гэтым ці што? — гучна пытае яна, паказваючы на старога.

— За гэтым, — гэтак жа моцна адказвае муж.

Пажылы чалавек стаіць не азіраючыся. Але па тым, як уздрыгнуў і яшчэ больш згорбіўся, я здагадваюся: пачуў размову, і яму зрабілася цяжка на душы.

Мне таксама цяжка — за яго, за сябе. Толькі маладыя людзі выпадкова занялі чаргу ззаду яго, а не за мною. Ім дык усё роўна: пра любога чалавека могуць гучна, як пра нежывы прадмет, сказаць: "За гэтым ці што?".

Усё думаю: ці ёсць мяжа паміж абыякавасцю языковай і душэўнай?

Назіральны зяць

Мой знаёмы пачаў гаварыць пра сваю цешчу. Яго жонка сядзела тут жа.

Гаварыў пра яе добра, паважліва, аднак — зусім нечакана — закончыў такімі словамі:

— Што і казаць, малайчына мая цешча. Адно дрэнна — скупая!

— Чаму ты так думаеш? — пытаюся ў яго.

— А як жа інакш... Прыедзем, бывала, да яе ў госці, пачне частаваць... І, ведаеш, шклянку коса ў руцэ трымае, калі ў яе налівае гарэлку. Нахіляе яе на бок...

— Ну ты! — абарвала яго жонка. — Сказаў такое: скупая! Ды яна, можа, таму шклянку наўскасяк трымае, каб ты прама стаяў...

Паступова

Іду па вясковай вуліцы. Насустрач — Майсюк. Здалёк пазнаю — ён. Яшчэ б не пазнаць! Калі мы пазнаёміліся, мне ішоў васемнаццаты, а яму было нешта каля трыццаці. Рэдка бачыліся ў апошнія гады, але вось сустрэліся і ціснем адзін аднаму рукі. Рука ў Майсюка — адчуваю — нібы наждак.

— Як жывеш, Іван?

— Пакрысе, як усе. Два гады ўжо на пенсіі.

— Што цяпер робіш?

Спытаў і бачу: сумеўся Іван, зніякавеў. Не хочацца яму адказваць.

— Ведаеш, — марудна гаворыць ён, — я месяцы тры толькі і адпачываў.

— Чаму так?

— Ды стаміўся я адпачываць за гэтыя тры месяцы, — сарамліва ўсміхаецца Іван, а потым тлумачыць: — Паблындаўся туды-сюды па двары, пакруціўся, як сабака на ланцугу... ну там плот... грады..., тое-сёе... Адпачыў, ды і кажу сабе: хопіць, Ваня, пашукай якую-небудзь работу. Ну і знайшоў. Прасцейшая, канечне. Лягчэйшая. А ўсё ж пры людзях. Нельга нам, пенсіянерам, адразу работу пакідаць. Нашага брата, хлопец, ад работы ўсё роўна, што дзіцёнка ад матчынай цыцкі, паступова трэба адвучаць. Паступова!

Прыгавор

Іду па лясной сцежцы з суседам. Раптам ён нахіляецца і падымае з зямлі пучок чарнічніку, праўдзівей — цэлы венік. Нехта павыскубаў у лесе чарнічнік з ягадамі, па дарозе іх абабраў са сцяблін, з'еў і кінуў на зямлю зялёны венік.

— Вось, — кажа сусед, — глядзі!

Бачу я абвялыя кусцікі, на якіх сіроціцца некалькі зялёных ягадзін, заўважаю паламаныя карэньчыкі, але яшчэ ніяк не магу дапетрыць, чаму голас у суседа такі ўстрывожаны.

— Дваццаць гадоў, вычытаў я, расце чарнічнік да першых ягад, — глуха гаворыць ён. — Падумаць толькі: дваццаць гадоў жыве адным — зачапіцца за зямлю, вырасці, даць ягады нарэшце, вось яны — з'явіліся! Няхай кожны збірае ды ласуецца на здароўе. Цяпер назбіраў і ў наступнае лета прыходзь у лес — зноў будуць. Дык не, лянуецца, не хоча збіраць па ягадзіне. Доўга. Лепш з карэннем чарнічнік выскубнуць — так хутчэй. І выскубвае. Глядзі. Дваццаць гадоў...

Сусед доўга маўчыць, а потым гаворыць, нібы выносіць прыгавор:

— Няхай бы рукі яму адсохлі!

У тралейбусе

У дзверы, цяжка сапучы, падымаецца сіваватая жанчына з дываном, скручаным у рулон. Яна ставіць яго на папа, прыхіляе да металёвага поручня і выцірае з ілба пот.

— Эй, цётка, — выгуквае з задняга сядзення малады хлопец у багатай шапцы, — і ахвота табе пад старасць цягацца з ім?!

Ён усмешліва аглядае ўсіх, шукаючы падтрымкі.

— А мне, саколік, не цяжка, — прастадушна адказвае жанчына. — Я па дыванах ніколі не хадзіла. Чацвярых без мужа выгадавала, вывучыла. Так выйшла. Не да дываноў мне было. А цяпер што! Хлопца жаніла, усіх дачок замуж аддала, а год назад сама выйшла за добрага чалавека. Вось і купіла дыванок: хоць па ім, па мяккім, босаю пахаджу. Я, можна сказаць, толькі жыццё пачынаю, а ты мне пра старасць...

Багатая шапка ні то збіраецца яшчэ нешта сказаць, ні то адчуўшы, што яго ніхто не падтрымлівае, круціць азадкам на сядзенні. Быццам бы нават збіраецца падняцца — саступіць месца.

— А ты сядзі-сядзі, — апярэджвае голас жанчыны. — Сядзі, кажу, пакуль малады. Пастарэеш — яшчэ настаішся.

Балюча

Ці то ў п'яным беспамяцтве, ці то гэты чалавек знарок напіўся, каб пакончыць з сабою — не ведаю...

Ён выпусціў са стрэльбы ў сябе зарад, які развярнуў шчэлепы, выбіў вока, знявечыў-скалечыў увесь твар.

А потым, калі працвярэзіўся, чалавек адчайна захацеў жыць. І не толькі жыць. Ачуняўшы, ён зрабіў усё магчымае, каб надаць твару хоць нейкі боскі выгляд. Пластычныя аперацыі... Адна, другая, трэцяя...

Я не быў знаёмы з гэтым чалавекам, але часам з ім сустракаўся, ведаў прозвішча і месца работы. І калі сустракаўся з ім на вуліцы, калі я мелькам, баючыся пакрыўдзіць, зіркаў у яго твар, напалову абвязаны чорнай павязкай, мне заўсёды здавалася, што ў яго адзінокім воку жыве непазбыўная маральная пакута.

Што фізічны боль! Ён яшчэ б перанёс шмат аперацый. Прырода дала яму здароўе на сто гадоў і здзіўляючую жывучасць, вынослівасць, сілу. Але як зажывіць муку, як пазбавіцца ад невыноснага ўсведамлення, што ты ва ўсім вінаваты сам... сам... сам...

І калі я задумаўся аб тым, што гэту невыносную, як нарыў, думку ён пастаянна носіць у сабе, з ёю кладзецца спаць, з ёю падымаецца з ложка, мне міжволі ўяўлялася, што нешта такое наканавана зведаць, адчуваць не яму аднаму... І мне... таксама...

Як часта мы ўчыняем такое, ад чаго потым, працвярэзіўшыся і раскаяўшыся, хацелася б упячы, схавацца... або неяк закрэсліць, забыць, быццам гэтага і не было! Ды не адпіхнеш, не пазбавішся, ніякім хірургічным нажом не адрэжаш. Курок спушчаны, і гэта тваё таемнае так і будзе мучыць, садніць навечна стрэмкаю думкай, што ва ўсім вінаваты ты сам... сам... сам...

Адна ўцеха: не ўсе ведаюць пра гэта...

У госці да мамы

У трамваі едуць бабуля з унукам. Яна старая, сівая, але яшчэ бадзёрая, цесна збітая ў целе. Надоўга і надзейна. Шмат гадоў, відаць, яшчэ будзе жыць.

Хлопчыку гадоў пяць.

— Бабуля, — раптам кажа ён, — давай сёння заедзем у госці да мамы...

Так і вырашылі.

Не, не, але часам і прыгадаецца мне гэтая незнарок падслуханая размова. Толькі падумаць — дзіця ездзіць у госці да мамы! Што ж, бабуля яшчэ пры добрым здароўі: паспее паставіць унука на ногі.

Але ці не згубіцца ў хлопчыка з дзяцінства нешта такое, што потым ужо ніколі-ніколі ён не знойдзе?

Прапаную!

Паважаная рэдакцыя "Народнай волі"!

Прапаную Вашай увазе падборку афарызмаў славенскага пісьменніка і рэжысёра Жарко Петана. Створаныя пад час смерці сацыялізму ва Усходняй Еўропе, афарызмы Петана працягваюць быць актуальнымі ва ўмовах "рыначнага сацыялізму", дзе ўсё выглядае як карыкатура і фарс у параўнанні з вопытам недалёкага мінулага.

З павагай сачу за Вашай дзейнасцю, лічу "Народную волю" адным з лепшых перыядычных выданняў у рэспубліцы.

Жадаю плёну і спакойнай працы!

Мікалай МАРЧАНКА.
Мінск.

Жарко Петан

Кто живет хорошо...

В дирижируемой экономике хорошо живут только дирижеры.

Не мясо стало дороже — деньги стали дешевле.

Умри сегодня — завтра похороны станут дороже.

Кто сеет слова, должен импортировать зерно.

Я тоже за то, чтобы туже затянуть ремни, но, пожалуй, не вокруг шеи.

Кто не работает, тот должен хотя бы есть.

Сперва выбьют зубы, а потом требуют, чтобы ты прикусил язык.

Ради лучшего будущего некоторые отлично устроились уже в настоящем.

Революционер — это или социалист при капитализме, или капиталист при социализме.

Не дай Бог, если политик будет оставаться у власти так долго, пока не станет настоящим обещанное им лучшее будущее.

Кто пил за государственный счет, того за счет государства и хоронят.

Политикой сильной руки обычно воодушевляется тот, у кого медный лоб.

Всякое начало трудно, в особенности начало конца.

На своих ошибках учатся, на чужих — наживаются.

Он был таким большим патриотом, что продал свою родину дороже, чем она стоила.

Пролетарии всех стран, соединяйтесь! Место сбора: Западная Германия.

История учит нас, что нельзя верить историкам.

Я готов защищать Родину, но что мне делать, когда Родина нападает на меня.

В политике обычно после весны наступает зима.

Искусство политика состоит в том, чтобы перерабатывать народ в массу.

Умный политик больше ориентируется на нежелания народа, чем на его желания.

Даже некоторых достойных людей можно купить, но только за достойную цену.

Говорить человек научается за два года, и потом всю жизнь он учится молчать.

У страха глаза велики — и микрофон вместо ушей.

У человека с узким кругозором обычно широкие и крепкие локти.

Моя любовь к Родине охладела, когда я узнал, что она изменяет мне с другими.

Сердце труса бьется быстрее, но зато и дольше, чем сердце героя.

Ценность лжи возрастает по мере отдаления от истины.

Собака виляет хвостом, человек — языком.

В жизни побеждает тот, кто приходит к цели последним.

Люди сейчас стали какие-то недоверчивые: их все труднее становится обманывать.

Есть люди, которые живут на процент с "Капитала" Маркса.

Историки фальсифицируют прошлое, идеологи — будущее.

Историки подобны театральному критику, пишущему о постановке, которую они никогда не видели.

Знаменитая мысль, что труд создал человека, пришла человеку в голову не во время труда, а во время отдыха.

Иной только потому платит головой, что у него не оказывается твердой валюты.

Иные историки пишут о прошлом, но думают при этом только о

Дайджест

Расовая проблема США решится скоро. Белых американцев станет не более 55 процентов

Газета "Детройт Ньюз" посвящает статью результатам, к которым приводят старания американского правительства увеличить этническое разнообразие Соединенных Штатов. Как отмечает газета, сегодня Америка переживает так называемый "расовый пессимизм", а это означает, что расовая принадлежность становится в Америке чуть ли не первым фактором, способным объяснить все, начиная с уличного ограбления и кончая экономическими проблемами. Однако, отмечает газета, проблема "расового пессимизма" нисколько не отражается на увеличении потока эмигрантов из разных концов света. Более того, по прогнозам ученых, демографическая ситуация в Америке со временем резко изменится. Число белых американцев сократится и составит не более 55 процентов всего населения США.

Восточная Европа не заметила... демократического превосходства

Газета "Джермани Лайв" анализирует ситуацию, которая сложилась в странах Восточной Европы после падения в них коммунистического режима. Газета отмечает, что страны бывшего социалистического лагеря представляют собой в настоящее время достаточно неприглядную картину. Газета сообщает, что по данным статистики, практически в каждой восточноевропейской стране после начала экономических реформ катастрофически выросли безработица, преступность, наркомания и прочие негативные явления, не присущие цивилизованному обществу. По мнению газеты, такая ситуация и печальный опыт стран Восточной Европы ставят под сомнение саму идею демократического общества и превосходства капиталистической системы хозяйствования.

Израильские ракеты для... польских вертолетов. На борту

Газета "Шверинер Альгемайне" публикует материал, посвященный ходу военной реформы в Польше. Газета сообщает, что польское правительство впервые за всю современную историю страны решило закупить крупную партию оружия не у России. По информации газеты, в настоящее время уже практически готов к подписанию договор между Польшей и Израилем на покупку большой партии ракет для новых моделей польских вертолетов. По оценкам экспертов, сумма сделки может превысить восемьсот миллионов долларов. Газета отмечает, что польские власти намерены заключить эту сделку, несмотря на то что израильская продукция является далеко не лучшей и при этом одной из самых дорогих. Однако, пишет газета, закупка столь крупной партии оружия имеет для Польши не практическое, а скорее политическое значение. Целью же сделки, по мнению газеты, является исключительно только демонстрация России своей независимости.

Подготовила Светлана РОСТОВА.

Подлодки "Трайдент", сменившие "Поларис", снова перевооружаются

